# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 1(47) 2006**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**


## Змест


***Галоўны рэдактар:***
**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
У. В. Амелькін
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў



***Гісторыя***

*Пуцік У. С.* Адлюстраванне сацыяльных аспектаў у дзейнасці мясцовых камітэтаў Асобай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці Паўночна-Заходняга краю ........ 3

*Рыжанкоў І. М.* Беларускае сялянства ва ўмовах падрыхтоўкі да аграрнай рэформы (сакавік — лістапад 1917 г.) ........ 8

*Ганчар А. І.* Праблемы ўзаемаадносін католікаў і праваслаўных на старонках газеты «Наша Ніва» (1906—1908 гг.) ........ 12

*Цымбал А. Г.* Праваслаўная Царква і нацыянальнае пытанне ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) ........ 16

*Доўнар Л. А.* Палітыка стымулявання кустарна-рамеснай вытворчасці Беларусі ў 20-х гг. XX ст. ........ 19

*Каспяровіч А. М.* Арганізацыя навучальнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах у 20-х гг. XX ст. ........ 23

*Груца І. А.* Бярэзінская версія лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона і каштоўнасцей Вялікай арміі ў ваеннай кампаніі 1812 г. ........ 27

*Якаўчук В. І.* Зараджэнне і развіццё ў Беларусі добраахвотных пажарных таварыстваў (другая палова XIX ст.) ........ 30

*Вінніца Г. Р.* Нацыянальная палітыка генацыду супраць яўрэйскага насельніцтва Мазыра ........ 33

*Малюгін А. І., Кавяка І. І.* Асаблівасці старажытнаегіпецкага пантэона ........ 36

*Цзян-Шу-і.* Расія і Тайвань: праблемы ўзаемаадносін ........ 40

*Пятроўская А. В.* Праблемы арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ Балгарыі і Польшчы (1944—1989 гг.) ........ 43

*Космач А. М.* Становішча Югаславіі ў палітыцы «разрадкі» паміж Усходам і Захадам у 70-х гг. XX ст. ........ 48

*Варывончык І. В.* Сярэдні клас і асаблівасці сучаснай сістэмы сацыяльнага забеспячэння ў ЗША ........ 57

***Філасофія***

*Навумаў Дз. І.* Палітыка-камунікацыйны аспект функцыяніравання палітычнай сістэмы постсавецкай Беларусі (паліталагічны аналіз) ........ 65

*Кузняцоў А. У.* Філасофія і рэвалюцыя (асноўныя этапы развіцця сацыяльнай думкі Новага часу) ........ 69

*Шапяцюк В. В.* Грамадзянскае грамадства і дзяржава: грані ўзаемадзеяння ........ 73

*Васько І. І.* Асэнсаванне канцэпцыі грамадзянскага грамадства ў сучаснай сацыяльнай думцы Рускай Праваслаўнай Царквы ........ 76

*Патоцкі А. А.* Камунікатыўная прырода традыцыі і яе роля ў працэсе разумення тэксту ........ 83


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Літаратура і крыніцы*

1. *Іофэ Э. Г.* Старонкі гісторыі яўрэяў Беларусі. Мн., 1996. С. 25.
2. Distribution of the Juwish population of the USSR 1939. Editor: Mordechai Alshuler. Jerusalem. 1993. P. 40.
3. Нам. наркома ўнутраных спраў БССР палкоўніку Місюраву. Рапарт ад нам. нач. Слуцкага між. РА НКУС сяржанта У. Е. Пальцава і ст. оперупаўнаважанага таго ж міжрайаддзела сяржанта ДБ Г. П. Раманенкава. НА РБ, ф. 4, воп. 33а, спр. 63, л. 242.
4. Памяць. Мазыр. Мазырскі раён. Мн., 1997. С. 209.
5. Паказанні Цітова А. Л. Архіў Упраўлення КДБ па Гомельскай вобл. 10454. Крымінальная справа па абвінавачанні І. П. Падбярэзнага — кіраўніка, А. Л. Цітова, А. Л. Супруна — паліцэйскіх Мазырскай паліцыі ( УДП ), л. 65.
6. Там жа, л. 147.
7. Кіраўніку 2-га аддзела НКУС СССР. Рапарт нач. 1 аддз. сакрэтнага палітычнага аддзела Кіравання наркамата ўнутраных спраў Палесскай вобл. сяржанта ГБ Мурзінава. НА РБ, ф. 4, воп. 33 а, спр. 63, л. 76.
8. Акт Палескай абласной камісіі садзейнічання працы Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі па расследаванні і ўстанаўленні злачынстваў, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ад 13 студзеня 1945 года. ДАРФ, ф. 7021, оп. 91, спр. 20, арк. 5.
9. Там жа, арк. 3.
10. Там жа, арк. 4.
11. Сведчанне М. П. Царашно. Філіял Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл. г. Мазыр, ф. 72, воп. 1, спр. 241, л. 85—86 [12].

*Summary*

*The nationality policy of genozide on the territory of Belarus is diseussed in the article. The mumber of victims of jewish population in Mozir is given.*

*УДК 932:251*

***А. І. Малюгін, І. І. Кавяка***

# АСАБЛІВАСЦІ СТАРАЖЫТНАЕГІПЕЦКАГА ПАНТЭОНА

Рэлігіі Старажытнага Егіпта, як і большасці іншых у старажытнасці, быў уласцівы політэізм. Існавала вялікае мноства багоў, увасабляўшых прыродныя з'явы (Хапі, Сохмет, Сет), нябесныя целы (Ра, Хонсу), абстрактныя паняцці (Маат, Сіа) і г. д. Аб складанасці егіпецкай рэлігіі можна меркаваць хаця б па тым факце, што навукоўцы налічваюць у пантэоне старажытных егіпцян дзве тысячы багоў. Да таго як Егіпет аб'яднаўся ў адзіную дзяржаву ў пачатку І дынастыі. Даліну Ніла насялялі сотні розных плямён, кожнае з якіх пакланялася сваім багам. Адны плямёны абагаўлялі сваіх правадыроў, другія — звяроў, рэптылій і птушак, трэція пакланяліся духам дрэў ці раслін. Пасля аб'яднання Егіпта ў адзіную дзяржаву бог горада ці правінцыі, адкуль паходзіла дынастыя, станавіўся вярхоўным бажаствам дзяржавы. Напрыклад, у Старажытным царстве у эпоху будаўнікоў пірамід дзяржаўным богам быў бог сонца Ра, якому пакланяліся ў Геліопале, што знаходзіўся недалёка ад сталіцы — Мемфіса. Пазней, калі сталі правіць дынастыі з Фіў, фіванскі бог Амон пацяснiў Ра. Два багі зліліся ў аднаго пад імем Амона-Ра. Але гэта не азначала, што сотні мясцовых багоў былі ліквідаваны. Ім працягвалі пакланяцца, а фіванскае жрэцтва ўключыла іх у сваю і без таго складаную тэалагічную сістэму [1, с. 215].

Аднак пры наяўнасці шэрага агульных рыс багі Старажытнага Егіпта мелі яўныя адрозненні ад багоў іншых старажытных народаў. Натуральна, што рэлігійныя ўяўленні ў кожнага народа фарміруюцца сваім шляхам, які, у сваю чаргу, вызначаецца мноствам умоў. У III тыс. да н. э., у эпоху Старажытнага царства, егіпецкая рэлігія была ўжо даволі склаўшымся светапоглядам. Яе асноўныя рысы і з'явы захаваліся да з'яўлення хрысціянства [2, с. 181]. Гэта зусім не азначае, што рэлігія егіпцян увесь гэты час заставалася ў абсалютна нязменным выглядзе. Змены, безумоўна, былі, але яны аказаліся не ў стане карэнным чынам змяніць аблічча і сутнасць рэлігіі ці пазбавіць яе характэрных рыс і асаблівасцей. Выключэннем з'яўляецца толькі рэформа Эхнатона, але ёй не суджана было прыжыцца ў Егіпце і яна пацярпела крах пасля смерці свайго стваральніка.

Адзначым галоўныя асаблівасці егіпецкай рэлігіі і яе прадстаўнікоў — багоў. Некалькі цікавых рыс мы можам заўважыць, калі прасочым схему выяўлення багоў. Выявы багоў Егіпта былі знойдзены ў руінах храмаў, дамоў, грабніц. Лічылася, што яны могуць магічнай сілай абараняць жыхароў дома ад заклінанняў і злога ўплыву. Мяркуючы па ўсім, егіпцяне верылі, што багі сяліліся ў статуях і фігурках, прысвечаных ім, таму яны рабілі гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фігуркі вельмі прыгожымі, надавалі належную форму і месцам іх знаходжання. Егіпцяне верылі, што выявы багоў могуць адказваць на пытанні. Так, трэба ўспомніць, што калі Хонсу спыталі, ці пойдзе ён у краіну Бахтан, каб вылечыць дачку князя той краіны ад хваробы, ён схіліў галаву ў знак згоды [3, с. 270]. Аднак як аказалася, што ў егіпцян не існавала нават правіл выяўлення багоў. Аднаго і таго ж бога выяўлялі то ў выглядзе якой-небудзь жывёлы, то ў выглядзе чалавека са звярынай галавой, а то і проста ў выглядзе чалавека [4, с. 9]. Большасць жа багоў выяўляліся ў выглядзе жывёл, гэта значыць іх выявы былі зааморфнымі. Гэта было, безумоўна, звязана з наяўнасцю вялікай колькасці свяшчэнных жывёл у Старажытным Егіпце. Да іх адносіліся леў, дзікі бык, кракадзіл, гіпапатам, павіян, антылопа і газель, сабака, кошка, баран, карова, свіння, каза, каршун, сокал, ібіс, гусь, змеі, жаба, скарпіён, жук-скарабей, мнаганожка і інш. У меншай меры было распаўсюджана шанаванне раслін: сікаморы, фінікавай пальмы, лотаса, папіруса, цыбулі [2, с. 189]. Парамі і паасобку егіпцяне з глыбокай павагай падыходзілі да сікаморы і працягвалі рукі, каб атрымаць ваду ад багіні, схаванай у гэтым дрэве. Кожны горад пакланяўся таксама і свайму свяшчэннаму дрэву [5, с. 274]. Нарэшце, абагаўляліся і шанаваліся розныя неадушаўлёныя прадметы — асобага выгляду слупы, скіпетры, эмблемы ўлады і г. д.

Даволі часта наяўнасць вялікай колькасці зааморфных багоў у егіпецкім пантэоне тлумачылася няспеласцю светапогляду егіпцян, прымітыўнасцю іх мыслення, прыхільнасцю да такіх ранніх форм рэлігіі, як татэмізм, анімізм, магія і фетышызм. Аднак не трэба рабіць асноўны акцэнт на несфарміраванасці егіпецкай рэлігійнай думкі і адсталасці народа ў цэлым. Бо нават калі ўзяць хрысціянства ў наш час і правесці яго аналіз, то акажацца, што яму таксама ўласцівы элементы і татэмізму (выяўленне Святога Духа ў выглядзе голуба, выкарыстанне выявы рыбы як сімвала хрысціян), і анімізму (вера ў вечнае жыццё душы, у анёлаў і злых духаў — пасланцаў д'ябла), і фетышызму (крыжы, медальёны, іконы). Такім чынам, мы можам назваць егіпцян народам са склаўшымся рэлігійным светапоглядам.

Значную частку інфармацыі аб егіпецкіх багах навукоўцы пачарпнулі з міфаў. Менавіта міфы далі нам магчымасць уявіць велічных і недаступных істот найлепшым чынам. У іх багі часта не адрозніваюцца ад людзей па сваіх паводзінах, кожны паўстае перад намі як індывідуальнасць — са сваім характарам, звычкамі, поглядамі. Па настроі аўтара можна прасачыць непасрэдныя адносіны егіпцян да дадзенага бажаства. Так, адны багі выступаюць перад намі як добрыя і справядлівыя суддзі, ахоўнікі парадку і заступнікі сумленных людзей; іншыя ж стаяць на баку зла, пастаянна строяць падкопы супраць добрых багоў і насылаюць розныя няшчасці на людзей. Аднак нават адзін і той жа міф можа мець некалькі версій, часам даволі супярэчлівых. Так, адзін і той жа ўчынак — стварэнне свету ці стварэнне людзей — у кожным буйным горадзе прыпісваўся розным багам. Увесь Егіпет шанаваў добрага бога Асірыса, адначасова шанаваўся яго забойца Сет. Імёны ў гонар Сета насілі фараоны, і адначасова Сета праклінал. У адным рэлігійным тэксце гаворыцца, што бог-кракадзіл Себек — вораг бога сонца Ра, а ў другім — яго сябар і абаронца. Зусім па-рознаму апісваецца ў тэкстах замагільны свет, і наогул, аб любой прыроднай з'яве ў егіпцян існавала мноства супярэчлівых уяўленняў [4, с. 10]. Супярэчнасці гэтыя, відаць, узніклі ў выніку таго, што ў розных номах і ў розныя часы складваліся супярэчлівыя версіі адных і тых жа легенд. Гэтыя паданні перадаваліся як у вуснай форме, так і неаднаразова перапісваліся, у выніку чаго скажаліся. Акрамя таго пры змене дынастый мяняліся і вярхоўныя багі Егіпта. Жрацы, каб дагадзіць новаму фараону, прыпісвалі ім розныя дадатковыя функцыі, ухвалялі адных багоў і забывалі другіх.

Трэба адзначыць, што адзін і той жа бог мог быць адначасова і добрым, і злым. Найбольш ярка гэта праявілася ў кульце Сета, роднага брата Асірыса. Шанаванне Сета ўзнікла яшчэ ў дадынастычны перыяд, калі Егіпет быў падзелены на Верхні і Ніжні. Заступнікам Верхняга Егіпта быў бог Гор, а заступнікам Ніжняга — бог Сет. К канцу IV тыс. да н. э. адбываецца аб'яднанне Егіпта; па афіцыйнай версіі, Верхні Егіпет падпарадкаваў сабе Ніжні, усталёўваецца I дынастыя, а Гор становіцца заступнікам царскай улады і абаронцам фараона. Існуе гіпотэза, што I дынастыя была скінута сілай, бо некаторыя фараоны II дынастыі называюць сябе ў гонар бога Сета — лютага ворага Гора. Далейшае развіццё культ Сета атрымаў у часы V дынастыі, пазней ён быў развіты ў асобных номах. Сет быў даволі папулярны да XIX дынастыі. Цары з гордасцю называлі сябе «ўлюбёнымі ў Сета», параўноўвалі сябе з ім па доблесці ў надпісах, прысвечаных сваім перамогам [3, с. 276].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першапачаткова гэты бог не лічыўся ўвасабленнем зла, але з распаўсюджаннем культу Асірыса — добрага бога, каварна забітага сваім братам — паступова ўкаранілася ўяўленне аб Сеце як аб злым бажастве, заслугоўваючым усенародную пагарду. У XVII ст. да н. э. Егіпет быў заваяваны гіксасамі і знаходзіўся пад іх уладай цэлае стагоддзе. Захопнікі аб'явілі Сета вярхоўным бажаством, і культ гэтага бога зноў расквітнеў. Яму пакланяліся як хоць і чужому, жорсткаму, але магутнаму богу. Тым больш ненавісным зрабіўся гэты бог у егіпцян пасля выгнання гіксасаў [4, с. 102]. Аднак у эпоху XIX дынастыі Сет зноў лічыцца заступнікам царскай улады, і некаторыя фараоны, узыходзячы на прастол, бяруць імёны ў яго гонар (Сеці I і Сеці II). У некаторых гарадах былі аракулы і свяцілішчы Сета. Такім чынам, хоць уяўленне аб Сеце як увасабленні зла было больш распаўсюджаным у егіпцян, але і ўяўленне аб ім як аб добрым бажастве ніколі не ўмірала.

Адметны факт стварэння трыяд (сям'я бога ў складзе яго самаго, яго жонкі-багіні і дзіцяці-бога (сына ці дачкі)) у кожным номе. Прыкладам можа служыць трыяда Мемфіса ў складзе бога Птаха, багіні Сохмет (яго жонкі) і бога Нефертума (іх сына) ці трыяда Элефанцін, дзе галоўным богам быў бог Хнум, багіня Сатыс паўставала яго жонкай, а багіня Анукіс — іх дачкой. Лік тры быў даволі папулярны ў старажытнаегіпецкай рэлігіі. Акрамя трыяд многія багі самі па сабе мысліліся ў трох іпастасях. Так, бог сонца прадстаўлены ў вобразах нараджаючагася ранішняга сонца (Хепры), жывога дзённага (Ра) і паміраючага вячэрняга (Атум). Часта некалькі багоў зліваліся ў аднаго ў выніку ствараемых жрацамі штучных сінкрэтычных сістэм, дзе мясцовы бог атаясамліваўся з іншымі багамі, ужо заняўшымі ў агульнаегіпецкім пантэоне вядучыя месцы [2, с. 197]. Так узнік культ Амона-Ра фіванскага. Мясцовага бога Амона, раней мала каму вядомага, спалучылі са знакамітым богам Геліопаля Ра і перанеслі на новае бажаство ўсе якасці вялікага бога сонца. У выніку Амон-Ра стаў універсальным богам.

Трэба заўважыць, што ў Егіпце існавалі багі як мясцовыя, так і агульнаегіпецкія. Некаторыя з мясцовых багоў з цягам часу станавіліся багамі ўсяго Егіпта (Ра, Птах, Амон, Тот), у выніку прыходзілася змяняць мясцовыя касмаганічныя і тэаганічныя тэорыі. Як вынік, з'яўляліся няўвязкі і супярэчнасці ў рэлігійных поглядах старажытных егіпцян. У многім з-за гэтага зараз бывае вельмі складана правесці мяжу паміж мясцовымі і агульнаегіпецкімі багамі.

Акрамя багоў, увасабляючых канкрэтныя прадметы, у егіпецкім пантэоне можна сустрэць багоў, якія абазначаюць абстрактныя паняцці. Такім быў бог пазнання Сіа і багіня справядлівасці і правасуддзя Маат. Усё, што вядома навукоўцам, у прыватнасці, аб Маат, гаворыць аб тым, што з ёй асацыіраваліся вельмі складаныя і вытанчаныя ўяўленні. Гэта быў не толькі аналаг грэчаскай Феміды, але і ўвасабленне ідэальнага сусветнага парадку, так неабходнага для людзей і саміх багоў [2, с. 186].

У сучаснае ўяўленне аб багах ці Богу не зусім упісваюцца наступныя якасці егіпецкіх багоў: згодна многіх міфаў, яны нараджаюцца, становяцца дарослымі, старэюць і нават могуць памерці. Прыкладам таму могуць паслужыць наступныя міфы: міф аб Ра і Ісідзе, аб знішчэнні чалавецтва, аб смерці і ўваскрэсенні Гора. У першым з іх бог сонца Ра быў укушаны змяёй і ледзь не памёр, але ад смерці яго выратавала багіня Ісіда, якая і падаслала змяю. «Он [Ра] шел своей обычной дорогой, священный змей вонзил в него свой клык, и живительный огонь стал покидать тело бога» [6, с. 88]. Далей сам Ра гаворыць наступнае: «Мое сердце залито пылающим огнем, мои конечности трясутся, а члены мои пронизывает боль […] я холоднее воды, я жарче огня, все мои члены в испарине, сам я дрожу, а взор мой ослаб. Я не могу взглянуть на небо, и пот заливает мое лицо, как во время разлива» [6, с. 89]. Перад намі ў наяўнасці сімптомы атручэння чалавека ядам змяі, але хто б мог падумаць, што багі такія ж слабыя, як і простыя смяротныя? У міфе аб знішчэнні чалавецтва мы сустракаем такія словы, сказаныя аб усемагутным Ра: «Но время шло, и великий Ра состарился. В крыльях его уже не было прежней силы, острые соколиные глаза перестали различать мелкие предметы, когда бог солнца взирал с поднебесной высоты на долину Нила, притупился слух, покрылись хлопьями седины голубые волосы» [4, с. 45], «…мужчины и женщины стали выражать недовольство, говоря: "Смотрите, Его Величество (Жизни, Сил и здравия ему!) стал стар, и его кости стали подобны серебру, а его члены обратились в золото, и его волосы стали как настоящий лазурит"» [6, с. 78—79]. У трэцім міфе апавядаецца аб смерці Гора, сына бога Асірыса і багіні Ісіды. Такім чынам, Гор і сам быў богам. Вось што гаворыцца ў апавяданні аб тым, як Гор быў укушаны Скарпіёнам: «Исида приблизила свой нос к его [Гора] устам, дабы почувствовать, дышит ли тот, кто был в своем гробу, и осмотрела она рану на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

следника бога, и увидела, что в ней был яд». Ахопленая вялікім горам, Ісіда гаворыць Ра: «Гор укушен, о Ра. Твой сын укушен [...], я хочу, чтобы сердце его ожило. Несчастье постигло дитя на воде, и ребенок погиб» [6, с. 134—135]. Як бачым, егіпецкія багі падвержаны ўсім напасцям зямнога свету: пакутуюць ад укусаў насякомых і звяроў, адчуваюць боль, старэюць, паміраюць. Яны паўстаюць ужо не як усемагутныя істоты, непахісныя нічым і нікім, а як звычайныя людзі. Аднак трэба адзначыць, што гэтыя міфы апісваюць жыццё багоў на зямлі, а не ў замагільным свеце.

Паводле міфаў, багі Старажытнага Егіпта валодалі дзіўнай уласцівасцю прысутнічаць адначасова ў многіх месцах. Прасочым гэта з дапамогай легенды аб падарожжы сонечнай Ладдзі (Ладдзі Вечнасці). Ра здзяйсняе гэта падарожжа разам са сваёй світай, у якую ўваходзяць таксама бог мудрасці Тот і багіня правасуддзя Маат. На сваім шляху Ладдзя перасякае Палац Дзвюх Ісцін, дзе адбываецца суд Асірыса над памерлымі. Там таксама знаходзяцца Тот і Маат. Тут зараджаецца ідэя аб усюдыснасці бога, якая пранікла пазней у многія рэлігіі і існуе да гэтага часу. Аднак, калі сёння гарантам вечнага жыцця ў большасці выпадкаў выступае маральная чысціня, то, на думку старажытных егіпцян, гэтымі гарантамі былі рытуальная чысціня (дакладнае выкананне рытуалу) і ўсемагутная магія [7, с. 221]. Служэнне культу зводзілася да таго, каб задавальняць зямныя патрэбы ажыўленых прысутнасцю нябачнага бога выяў і ўшаноўваць іх. Інакш кажучы, служэнне культу заключалася ў асноўным у акуратным выкананні розных абрадаў у адносінах да бажаства, а зусім не ў прытрымліванні этычных норм. Так, галоўны жрэц штодзённа пераапранаў, націраў, сімвалічна карміў і паіў статую бажаства. Важную ролю ў выкананні культу адыгрывалі ахвярапрынашэнні — быкі, антылопы, козы, гусі, кандытарскія вырабы, кветкі, а таксама піва і малако [7, с. 169—172]. Нават у аснове старажытнаегіпецкага культу памерлых быў клопат аб іх матэрыяльным дабрабыце. Сведчанне на карысць вялікага значэння рытуалу ў жыцці егіпцян — гэта надпісы на сценах грабніц. Такім чынам, парушэнне не этычных норм, а рытуалу з'яўляецца пакуль асновай для прыцягнення парушальніка да адказнасці перад божым судом. З часам духоўныя патрэбы грамадства паступова ўзрастаюць. З канца эпохі Старажытнага царства назіраецца даволі адчувальнае ўзаемапранікненне двух прынцыпаў — рытуальнага і этычнага. Пачынаючы з першага пераходнага перыяду, удзельная вага элементаў этыкі ў памінальных тэкстах усё больш павялічваецца [7, с. 222—225].

Адсутнасць спачатку этычнага элемента ва ўзаемаадносінах багоў і людзей была, безумоўна, звязана з уяўленнямі аб судзе Асірыса ў замагільным свеце. Егіпцяне верылі, што можна кіраваць любым жывым ці нежывым прадметам, калі вядома яго сапраўднае імя. Як вядома, у Кнізе Мёртвых былі адзначаны імёны ўсіх багоў, дэманаў і іншых істот, з якімі памерлы вымушаны быў сутыкнуцца на шляху да Палаца Дзвюх Ісцін і ўнутры яго. У працэсе суда багі ацэньвалі зямныя ўчынкі памерлага. Памерлы, у сваю чаргу, ведаючы імёны ўсіх багоў, мог адмаўляць перад імі ўсемагчымыя грахі і быў бы апраўданы. Бажаство, якое чула сваё імя з вуснаў чалавека, пападала пад яго ўладу і было не ў сілах працівіцца яго волі і жаданням. Існуе думка, што такім чынам егіпцяне маглі бясконца грашыць у зямным жыцці і абсалютна абгрунтавана разлічваць на шчаслівае існаванне ў Палях Іару. Яны былі ўпэўнены, што, ведаючы Кнігу Мёртвых, змогуць паспяхова вытрымаць выпрабаванні на судзе Асірыса. Аднак гэта ўсяго толькі гіпотэза. Пазней, з фарміраваннем этычнага элемента, замагільны свет падзяляўся на рай, пекла і нешта накшталт чысцілішча, дзе, адбыўшы пэўнае пакаранне, чалавек усё ж мог разлічваць на вечнае шчасце. Упамінанне аб гэтым утрымлівае паданне аб Сатні-Хемуасе, у якім ён наведвае замагільны свет і бачыць усё сваімі вачыма. Тут ужо багі непадуладныя чалавеку, і суд Асірыса выносіць справядлівы прыгавор: «Люди, которые вьют веревки,— это подобие тех, над кем на земле тяготеет проклятие богов. Они трудятся день и ночь, дабы увеличить свое богатство, но золото утекает, как вода сквозь решето, и у них не хватает даже хлеба, чтобы наесться досыта. Когда они приходят в Дуат и выясняется, что их злодеяния многочисленнее добрых дел, боги обрекают их на то же самое, что с ними было на земле… Тем, кто на земле творил добро, здесь тоже воздается добром, а тем, кто совершал зло, воздается злом. Так было, так есть — и не изменится никогда» [4, с. 137—140].

Сёння багі егіпцян і самі іх уяўленні аб замагільным жыцці здаюцца нам даволі дзіўнымі і нават прымітыўнымі. На гэта ўказвае зааморфнае аблічча большасці багоў, прысутнасць і адсутнасць сярод іх дакладнага падзелу на добрых і злых. У той жа час у рэлігіі Старажытнага Егіпта зараджаюцца ідэі і вобразы, што атрымаюць сваё далейшае развіццё, аказваючы непасрэдны ўплыў на фарміраванне су-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

часнай рэлігійнай думкі. Як непаўторны і разнастайны свет, так і ўяўленні аб ім, створаныя людзьмі, якія ўвасобіліся ў сучаснай веры і ў веры старажытнай.

*Літаратура*

1. *Котрелл Л.* Во времена фараонов. М., 1982.
2. *Струве В. В., Кацнельсон И. С.* и др. Культура древнего Египта. М., 1976.
3. *Бадж Э. А.* Мумия. Материалы археологических раскопок египетских гробниц : пер. с англ. М., 2001.
4. Мифы и легенды народов мира. Древний Египет / А. И. Немировский, Л. С. Ильинская. М., 2004.
5. *Монтэ П.* Египет Рамсесов. М., 1989.
6. *Бадж Э. А. У.* Египетская книга мертвых : пер. с англ. М., 2004.
7. *Коростовцев М. А.* Религия Древнего Египта. М., 1976.

*Summary*

*This article is devoted to the peculiarities of the religion of the Ancient Egypt. It says both about interesting and unique features of the religion at that time and its connection with modern faiths. Special attention is paid to the pantheon and the mythology, in which Egyptian cosmogonies and theogonies are reflected most of all.*

*УДК 947+951.2*

***Цзян-Шу-і***

## РАСІЯ І ТАЙВАНЬ: ПРАБЛЕМЫ ЎЗАЕМААДНОСІН

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Распад Савецкага Саюза пацягнуў за сабой неабходнасць для Расіі правядзення новай, свабоднай ад старых прымхаў і ідэалагічных пастулатаў знешняй палітыкі. Характэрнай рысай першых гадоў стаў карэнны перагляд адносін з Захадам, збліжэнне з ім на аснове прызнання асноўных прынцыпаў дэмакратычнага ладу грамадства і правядзення знешнепалітычнага курсу, нацэленага на ліквідацыю наступстваў «халоднай вайны» і раўнапраўнае, узаемавыгаднае эканамічнае супрацоўніцтва. Апошняе ўяўлялася расійскаму кіраўніцтву асабліва важным з прычыны эканамічных цяжкасцей і неабходнасці рэфармавання эканомікі на рынкавых асновах.

У такіх умовах пачаўся якасна новы этап ва ўзаемаадносінах Расіі і Тайваня. У 1992 г. намеснік міністра замежных спраў Тайваня Чжан Сяоянь двойчы пабываў з візітам у Маскве, урад Тайваня прадаставіў Расіі статус найбольшага спрыяння ў гандлі і бязвыплатна перадаў Расіі 100 тыс. т харчавання. Расійская Федэрацыя станоўча адрэагавала на сяброўскія дзеянні тайваньскага боку. У 1992 г. Тайвань наведалі неафіцыйныя дэлегацыі, у якія ўваходзілі былыя і дзеючыя дзяржаўныя дзеячы. У тайваньскіх газетах з'явіліся паведамленні аб станоўчых адносінах Расіі да перспектывы развіцця рознабаковых сувязей паміж дзвюма краінамі [1, с. 4]. Знакавымі ўяўляліся для тайваньскага боку заява, зробленая на Тайвані ў ліпені 1992 г. былым адміралам Ціхаакіянскага флоту РФ Уладзімірам Сідаравым: «Российские вооруженные силы развивают отношения и стоят в одном строю со всем свободным миром», стварэнне 3 верасня 1992 г. Маскоўска-Тайбэйскай каардынацыйнай камісіі па эканамічным і культурным супрацоўніцтве. У інтэрв'ю тайваньскім журналістам старшыня камісіі Алег Лобаў назваў Тайвань «дзяржавай» [2, с. 1; 3, с. 6].

Развіццё адносін паміж Тайванем і Расіяй выклікала неспакой у КНР. Кітайскі бок неаднаразова выказваў надзею, што, развіваючы адносіны з Тайванем, Расія будзе праяўляць абачлівасць. Хваляванні былі марныя. На афіцыйным узроўні ніякіх змяненняў не адбывалася, расійскі бок зноў і зноў заяўляў аб нязменнасці палітыкі «аднаго Кітая» [4, с. 4].

У расійскай палітыцы ў адносінах да Тайваня можна выдзеліць наступныя аспекты: эканамічныя сувязі, палітычныя фактары і праблемы бяспекі.

Імкнучыся развіваць эканамічныя сувязі з Тайванем, Масква абмяжоўвала іх рамкамі неафіцыйнага ўзаемадзеяння. Нягледзячы на цесныя кантакты паміж прадстаўнікамі дзелавых колаў Тайваня і Расіі, апошняя заўсёды ўстрымлівалася ад наладжвання афіцыйных кантактаў у эканамічнай сферы. Нягледзячы на гэта, назіраўся ўпэўнены рост тавараабароту. У 1993 г. аб'ём гандлю паміж Расіяй і Тайванем склаў 1,23 млрд долараў ЗША, а к 1995 г. дасягнуў 1,8 млрд долараў. У 2004 г. тавараабарот паміж дзвюма краінамі склаў каля 2,9 млрд долараў ЗША. Пры гэтым важна адзначыць, што баланс гандлю складваецца на карысць Расійскай Федэрацыі — расійскі экспарт ацэньваўся ў 2,044 млрд [5, с. 4].

У сферы палітыкі тэзіс «аднаго Кітая» паслядоўна адстойваўся расійскай дыпламатыяй. 15 верасня 1992 г. прэзідэнт Барыс Ель-